і рэабілітацыйныя мерапрыемствы з мэтай захавання і прадаўжэння прафесійнай працаздольнасці працоўных з ўлікам стану іх здароўя і псіхалагічных асаблівасцяў арганізму.

Такім чынам, існуючыя праблемы працоўнай занятасці людзей шаноўнага ўзросту павінны вырашацца комплексам дзяржаўных мерапрыемстваў з улікам дэмаграфічных, сацыяльна-эканамічных, палітычных умоў, пры гэтым вынікам павінен стаць зменены працоўны кодэкс, у якім будуць прапісаны як льготы, так і штрафныя санкцыі для працуючых пенсіянераў.

**М. І. Сянкевіч**
Брэст, БрДУ імя А. С. Пушкіна

## МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Працэс навучання беларускай мове адбываецца пры актыўнай дзейнасці яго суб'ектаў. Спосабы сумеснай дзейнасці настаўніка і вучняў па авалоданні школьнымі ведамі і практычнымі ўменнямі называюць метадамі навучання.

Разгледзім паслядоўна найбольш распаўсюджаныя і прызнаныя школьнай практыкай метады навучання беларускай мове.

***Паведамленне настаўніка.*** Сутнасць дадзенага метаду заключаецца ў тым, што настаўнік выкладае новую тэму сам, у строгай логіцы, з элементамі разважання і доказу. Педагог абапіраецца на даступныя прыклады, наглядныя запісы, табліцы і плакаты. Між тым паведамленне настаўніка – не суцэльны маналог. Каб актывізаваць працу класа, ён выкарыстоўвае адпаведныя метадычныя прыёмы:

– прыём прадметных дзеянняў (на дошцы запісваюцца моўныя факты, з імі праводзяцца рознага кшталту канструктыўныя пераўтварэнні);

– перыфраза (паўторнае тлумачэнне на аснове іншага моўнага матэрыялу);

– параўнанне (звяртаецца ўвага на падабенства і адрозненне паміж моўнымі з'явамі);

– выкарыстанне сродкаў нагляднасці (схемы, табліцы).

Паведамленне настаўніка ў пачатковай школе не можа працягвацца больш за 7–8 хвілін. Такі метад выкарыстоўваецца звычайна тады, калі вучэбны матэрыял новы для вучняў, дастаткова вялікага аб'ёму або цяжкі для разумення.

***Гутарка.*** Гэты метад навучання заснаваны на дыялогу паміж настаўнікам і вучнем. Гутаркі бываюць наступных тыпаў:

– падрыхтоўчая (узнаўленне па пытаннях настаўніка раней вывучанага для стварэння апоры пры засваенні новага);

– эўрыстычная (настаўнік з дапамогай пытанняў падводзіць дзяцей да ўсведамлення новага);

– узнаўляльная (яна праводзіцца пры замацаванні вывучанага з мэтай абгрунтавання вучэбных дзеянняў. Настаўнік ставіць пытанне: “Што трэба зрабіць, каб..?»);

– параўнальна-абагульняльная (выкарыстоўваецца пры паўтарэнні вывучанага ў канцы ўрока ці тэмы ў цэлым).

Названы метад надзвычай пашыраны, бо ў тым ці іншым выглядзе ён прысутнічае на кожным этапе ўрока. Гутарка выкарыстоўваецца тады, калі матэрыял у пэўнай меры ўжо знаёмы вучням, а новая тэма можа быць супастаўлена з ужо вядомым.

Метад гутаркі шырока практыкуецца на ўроках развіцця звязнага маўлення пры падрыхтоўцы вучняў да пераказаў і сачыненняў.

***Практыкаванні.*** Гэты метад патрабуе шматразовага і варыятыўнага выкарыстання атрыманых ведаў на практыцы з мэтай выпрацоўкі ўменняў і навыкаў. Без практыкаванняў школьнае навучанне будзе схаластычным.

Практыкаванні быаюць:

– аналітычныя (аналіз тэкстаў, слоў, словазлучэнняў, сказаў; параўнанне моўных адзінак па функцыі, будове і значэнні);

– аналітыка-сінтэтычныя (запіс слоў, сказаў, тэкстаў з заданнямі, накіраванымі на выбар формы слова, устаўку літар, слоў, славазлучэнняў, пастаноўку знакаў прыпынку;

– сінтэтычныя (канструяванне сказаў і тэкстаў).

На ўроках беларускай мовы практыкаванні займаюць прыкладна 80 % часу, таму вельмі важна, каб яны былі мэтанакіраванымі і выкарыстоўваліся ў пэўнай сістэме. Адно і тое ж практыкаванне можа мець мноства варыянтаў і мадэфікацый. Настаўнік у залежнасці ад падрыхтоўкі класа можа ўдакладняць метадычны апарат практыкавання і яго аб’ём. Аднак такія змены павінны быць матываванымі.

***Самастойная праца.*** Гэты метад выкарыстоўваецца тады, калі настаўнік будзе перакананы, што вучні самі змогуць разабрацца ў тэарэтычным матэрыяле. Важным момантам з’яўляецца арганізацыя самастойнай працы. Настаўнік павінен абавязкова паставіць перад дзецьмі вучэбную задачу. Можна запісаць апорныя пытанні. Вельмі важна навучыць дзяцей удумліва чытаць умову практыкавання. Самастойная праца павінна выкарыстоўвацца на кожным уроку.

***Лінгвістычны эксперымент.*** Сутнасць гэтага метаду ў тым, што шляхам замены ці падстаноўкі слоў, словазлучэнняў, сказаў выпрабоўваецца найбольш мэтазгоднае і апраўданае выкарыстанне моўных сродкаў або матывуецца іх аўтарскі выбар як найбольш аптымальны.

***Эўрыстычны (пошукавы) метад.*** Гэта метад навучання праз адкрыцці, рашэнне творчых задач. Эўрыстычная методыка карысная тым, што вучыць бачыць і ўсведамляць праблему, шукаць магчымыя спосабы яе вырашэння, параўноўваць іх і выбіраць аптымальны варыянт.

***Граматычнае мадэліраванне.*** Гэты метад выкарыстоўваецца як абагульненне вывучанага матэрыялу ў выглядзе граматычных схем і мадэлей. У якасці спосабаў рэалізацыі гэтага метаду можна назваць складанне плана, аналіз тэксту-ўзору, канструяванне тэксту па ўзоры і інш.

***Алгарытмізацыя.*** Названы метад звязаны з распрацоўкай алгарытмаў (сукупнасці правілаў, што вызначаюць паслядоўнасць рашэння граматычных задач). Перш чым карыстацца алгарытмам, настаўнік паказвае ўзор правільнага ходу думак і сумесна з вучнямі складае схему паслядоўнасці лагічных аперацый. Вось як можа выглядаць алгарытм правапісу прыставак на “з”, “с”:

– вымавіце слова, назавіце часціну мовы;

– вылучыце прыстаўку, прывёўшы доказы;

– вызначце, які зычны (глухі ці звонкі) стаіць пасля прыстаўкі;

– дзейнічайце наступным чынам: калі корань пачынаецца са звонкага зычнага, то ў прыстаўцы пішыце літару “з” (зэ), а калі з глухога – літару “с” (эс).

Алгарытмы могуць давацца настаўнікам у гатовым выглядзе, а могуць складацца пад яго кіраўніцтвам вучнямі. Яны могуць таксама складацца вучнямі самастойна пасля знаёмства з правілам.

Спачатку алгарытм выкарыстоўваецца калектыўна: дзеці разам з настаўнікам вучацца кіравацца ім пры аналізе 1–2 прыкладаў. Як толькі малодшыя школьнікі запомнілі паслядоўнасць аперацый і навучыліся самастойна выконваць іх, ім даецца магчымасць выконваць практыкаванні без каментарыяў уголас.

Алгарытмы дапамагаюць да мінімуму скараціць колькасць правіл, якія трэба запомніць, аб’яднаць разрозненыя правілы.

Работа з алгарытмамі можа быць паспяховай толькі ў тым выпадку, калі з боку настаўніка вядзецца *кантроль* за разумовымі дзеяннямі вучняў, калі гэтыя дзеянні фіксуюцца графічна. Настаўнік паступова падводзіць дзяцей да *згортвання* алгарытму, да карыстання ім без каменціравання ўслых. Задача педагога – не дапускаць, каб дзеці пісалі, арыентуючыся на слыхавы, зрокавы і рухальны вобраз, бо ім часта не хапае цярпення раскласці правіла на часткі, і яны дзейнічаюць па сваіх стыхійных правілах.

***Выкарыстанне тэхнічных сродкаў.*** Апошнім часам усё часцей выкарыстоўваюцца камп’ютарныя вучэбныя і дыягнастычныя праграмы па беларускай мове. Спачатку настаўнік павінен распрацаваць сцэнарый урока,

на аснове якога ствараецца спецыяльная камп'ютарная праграма. Матэрыял разбіваецца на асобныя блокі.

Выкарыстанне камп'ютарных вучэбных праграм найперш карысна для фарміравання арфаграфічных навыкаў і кантролю.

***Наглядныя метады.*** Гэта выкарыстанне *слыхавой нагляднасці* (выразнае чытанне настаўніка, падкрэслена правільнае вымаўленне, інтанацыя і інш.), а таксама *зрокавай нагляднасці* (табліцы, малюнкі, схемы і інш.).

***Гульня.*** Функцыя дыдактычнай гульні – ажывіць і палегчыць дыдактычны працэс.

***Параўнальны метад навучання беларускай мове.*** Ён шырока выкарыстоўваецца пры вывучэнні роднасных моў. Гэты метад папярэджвае інтэрферэнцыю, г. зн. перанясенне у маўленні асаблівасцей адной мовы на другую, і патрабуе ад настаўніка добрага ведання спецыфікі як роднай, так і рускай мовы.

Параўнальны метад паспяхова выкарыстоўваецца тады, калі матэрыял, што вывучаецца на адной мове, ужо засвоены вучнямі па другой мове.

Параўнальны метад ляжыць у самой структуры ўрока і з'яўляецца асноўным сродкам раскрыцця яго тэмы.

Прыкладная структура ўрока на аснове параўнальнага метаду можа быць наступнай:

– запіс на дошцы тэмы і вуснае паведамленне задач урока;

– узнаўленне ў памяці дзяцей вывучанага матэрыялу на другой мове (дзеці расказваюць правіла на той мове, на якой яно вывучана);

– пераклад тэрмінаў і вядомага правіла на мову, на якой вядзецца ўрок;

– аналіз моўнага матэрыялу, падбор прыкладаў.

Названыя этапы займаюць першую палову ўрока, а другая яго палова адводзіцца на замацаванне, выкананне практыкаванняў.

Заканчваецца ўрок падвядзеннем вынікаў.

Школьная практыка ведае мноства *метадычных прыёмаў* навучання беларускай мове. У многіх выпадках яны індывідуальныя, уласцівыя толькі асобнаму настаўніку. Разгледзім толькі некаторыя з іх.

Адным з асноўных метадычных прыёмаў, які выкарыстоўваецца на працягу ўсяго ўрока, пры любым метадзе навучання з'яўляюцца ***пытанні настаўніка.***

Усе пытанні, якія задзейнічае настаўнік, можна падзяліць на дзве групы:

а) пытанні, якія дапамагаюць растлумачыць матэрыял і спрыяюць яго запамінанню;

б) пытанні, пры дапамозе якіх высвятляюцца веды і ўменні вучняў.

Спынімся спачатку на практыкаваннях першай групы.

*Рытарычныя пытанні.* Яны дапамагаюць падтрымліваць увагу вучняў на ўроку, прымушаюць думаць і разважаць. На рытарычныя пытанні дзеці

не адказваюць. Паставіўшы такое пытанне, настаўнік робіць паўзу, каб даць вучням магчымасць падумаць над адказам. Пасля паўзы ён сам адказвае на пастаўленае пытанне, а дзеці правяраюць правільнасць сваёй думкі.

*Альтэрнатыўныя пытанні.* Гэта пытанні, пры дапамозе якіх настаўнік дабіваецца выдзялення патрэбных слоў у сказе, патрэбных частак слова, што звязаны з правілам. Напрыклад: якія з запісаных на дошцы слоў адносяцца да прыметнікаў (прыгожы, прыгажосць, упрыгожыць; бель, бяліць, белы)? У школе іншы раз карыстаюцца ілжэальтэрнатыўнымі пытаннямі, пры адказе на якія няма ўмоў для разважання, аналізу і выбару. Напрыклад: гэта дзейнік ці выказнік?

*Аналітычнае пытанне.* Яно ўсяго адно: "Чаму?".

*Праблемныя пытанні.* Яны накіраваны на вырашэнне праблемнай сітуацыі пэўнай цяжкасці, якую вучні павінны пераадолець, абапіраючыся на свае веды і вопыт. Праблемныя пытанні – адзін з найбольш эфектыўных шляхоў развіцця творчай актыўнасці вучняў. Напрыклад: Якая роля літары *ё* ў слове "лён"?

*Пытанні, накіраваныя на засваенне тэрмінаў.* Іх усяго два. Адно разлічана на запамінанне тэрміна, другое – на запамінанне правіла. Напрыклад, пасля таго, як "выведзена" азначэнне такога паняцця, як "назоўнік", вучні задаюць пытанні да прачытанага па падручніку правіла: "Што абазначае назоўнік?" і "Як называюцца словы, якія абазначаюць прадмет і адказваюць на пытанне *хто?* або *што*?".

*Пытанні, што "наводзяць" на думку.* Пачнём адразу з прыкладу: у слове «расказаць» вучань не ведае, чаму трэба пісаць літару *с*. Настаўнік пытае, якім гукам пачынаецца корань у слове.

Пры пастаноўцы любых пытанняў, якія дапамагаюць засваенню ведаў, трэба прытрымлівацца лагічнай паслядоўнасці, дабівацца таго, каб адказ на адно пытанне быў звязаны з пастаноўкай другога.

*Пытанні, пры дапамозе якіх высвятляюцца веды і ўменні вучняў,* могуць быць у выглядзе пытальных ці пабуджальных сказаў або ў выглядзе кантрольнай задачы. Пры пастаноўцы гэтых пытанняў улічваецца ступень цяжкасці, ступень засваення матэрыялу, аўтаматызм навыку. Ад гэтага залежыць працягласць паўзы.

Запамінанню многіх правіл граматыкі і арфаграфіі дапамагаюць ***мнеманічныя прыёмы***. *Мнемоніка* (гр. *mnemonika* – майстэрства запамінання) – сукупнасць правіл і прыёмаў, якія маюць на мэце аблягчыць запамінанне як мага большай колькасці звестак і фактаў [1].

Як метад і метадычны прыём можна разглядаць ***працу з падручнікам***. Калі падручнік выкарыстоўвацца як метад навучання, у такіх выпадках па ім чытаецца і завучваецца правіла, пасля чаго арганізуецца работа па яго замацаванні і выкарыстанні на практыцы.

Калі правіла вывучаецца эўрыстычным метадам, а пасля зачытваецца і завучваецца па падручніку, то ў гэтым выпадку падручнік выступае ў якасці метадычнага прыёму.

Вартасць падручніка ў тым, што ў ім ёсць выразная логіка прадмета, запраграмаваная методыка. Падручнік забяспечвае навуковасць і сістэматычнасць у падачы матэрыялу, рэгламентуе паслядоўнасць выканання практыкаванняў. Маладому настаўніку і студэнту-практыканту не рэкамендуецца парушаць паслядоўнасць практыкаванняў у падручніку. Задача настаўніка, які толькі пачынае сваю прафесійную дзейнасць, – знайсці спосабы, каб кожнае з іх было выкарыстана на ўроку. Настаўнік павінен вырашыць, якія практыкаванні будуць дадзены вусна ці пісьмова, у цэлым ці выбарачна. У такім выпадку не будзе парушана сістэма падручніка і ён выканае сваю ролю – падасць дзецям матэрыял у лагічнай паслядоўнасці.

Падручнік можа выкарыстоўвацца як метадычны прыём на розных этапах урока (праверка дамашняга задання, замацаванне вывучанага, абагульненне, падвядзенне вынікаў).

Такім чынам, настаўніку вельмі важна выбраць аптымальны, найбольш выніковы метад тлумачэння матэрыялу, які вывучаецца, спалучыць яго з іншымі метадамі і метадычнымі прыёмамі. Выбар і спалучэнне метадаў – самае цяжкае пытанне ў практычнай дзейнасці настаўніка.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Сянкевіч, М. І. Эўрыка! Адкрываем правіла. Методыка завучвання арфаграфічных правілаў і азначэнняў граматычных паняццяў / М. І. Сянкевіч // Пачатк. шк. – 2012. – № 5. – С. 8–9.

**Т. Л. Тоболевич, О. В. Щерба**
Брест, БрГТУ

## КУЛЬТУРОЛОГИЧЕСКИЙ ПОДХОД В ПРЕПОДАВАНИИ РУССКОГО ЯЗЫКА ИНОСТРАННЫМ СТУДЕНТАМ

Для коммуникативного успеха в чужой языковой среде иностранный студент должен знать и понимать культурологические особенности страны проживания и страны изучаемого языка. Культурологический подход к преподаванию русского языка иностранцам, или обучение межкультурной коммуникации, определяют основное направление современных лингвометодических исследований [1, с. 204].

Общеизвестно, что язык – это отражение ментальности народа, поэтому его нельзя изучать в отрыве от национальной культуры, поскольку он содержит присущие народу особенности, показывает своеобразие куль-